# 2023 г. – 70 гадоў з часу заснавання УП «КОБРЫНСКАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА МЕЛІЯРАЦЫЙНЫХ СІСТЭМ» (1953)

УП «Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных систэм» (УП «Кобрынскае ПМС») - адно з найбуйнейшых меліярацыйных прадпрыемстваў Брэстчыны з багатай гісторыяй.

Гісторыя меліярацыі Кобрыншчыны пачалася з першага меліярацыйнага канала, які з'явіўся ў той час, калі тутэйшымі землямі валодала каралева польская і вялікая княгіня літоўская Бона Сфорца. З 1550 года яна задумала маштабную аграрную рэформу, падчас якой былі зроблены першыя спробы меліярацыі. Канал носіць імя каралевы Боны з сярэднявечча і служыць людзям да нашых дзён, упадаючы ў межах Кобрына ў Мухавец, з'яўляецца самым старажытным меліярацыйным аб'ектам не толькі Берасцейшчыны, але і Беларусі. Аб гэтым сведчыць памятны знак першаму меліярацыйнаму каналу, які ў 2001 годзе ўсталяваны ў Кобрыне. У спісе найстарэйшых гідратэхнічных збудаванняў ёсць яшчэ некалькі каналаў (Кобрынскі, Каралеўскі, Арэхаўскі і г. д.), якія знаходзяцца на тэрыторыі раёна і сёння выконваюць функцыі водапрыёмнікаў меліярацыйных сістэм Кобрыншчыны.

У канцы XIX стагоддзя на Палессі, у тым ліку на землях Кобрынскага раёна, выконваліся асушальныя работы. Пабудаваныя ў тыя гады каналы сталі правобразам разгалінаванай меліярацыйнай сеткі, якая стваралася ў наступныя перыяды. Адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны, нягледзячы на складанасць эканамічнага становішча, на аднаўленне меліярацыйных аб'ектаў выдзяляліся бюджэтныя сродкі. На пасляваенны час прыходзіцца ўвядзенне ў штат раённых спецыялістаў-меліяратараў. У 1946 годзе такім спецыялістам у Кобрынскім раёне стаў Сцяпан Іванавіч Вараб’ёў.

1953 год - новы этап у развіцці меліярацыі земель. У раёнах рэспублікі ствараліся аддзелы меліярацыі, і ў сакавіку 1953 года намеснікам міністра меліярацыі Беларускай ССР М. Сідоркіным быў падпісаны загад № 112 аб арганізацыі ў

Кобрыне Мухавецкага ўпраўлення тэхнічнай эксплуатацыі асушальных сістэм, пазней перайменаванае ў Мухавецкае ўпраўленне асушальных сістэм (УАС). Першым яго кіраўніком стаў Мікалай Паўлавіч Угляніца.

За час існавання ўпраўленне змяняла сваю дыслакацыю, умацоўвалася яго вытворчая база. Мяняліся і назвы прадпрыемства: міжраённае ўпраўленне асушальных сістэм (МУАС), міжраённае ўпраўленне асушальных і арашальных сістэм (МУААС), рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Кобрынскае ПМС». У 2002 годзе ў сувязі са зменай уласнасці зноў адбылося перайменаванне: РУП «Кобрынскае ПМС» стала называцца УП «Кобрынскае ПМС».

За 70 гадоў Кобрынскае ПМС, як і ўся меліярацыйная сфера, перажывала розныя часы. Былі перыяды росквіту - у часы СССР, і адкрытага заняпаду - у дзевяностыя. 2000 год стаў для меліярацыйнай галіны значным: была зацверджана і запушчана ў дзеянне рэспубліканская праграма «Захаванне і выкарыстанне меліяраваных зямель на 2000-2005 гады». Сёння рэалізуецца праграма, прынятая на 2021-2025 гады.

У Кобрынскім раёне сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць 104 тысячы гектараў, з іх на 101 меліярацыйнай сістэме размешчана каля 66 тысяч гектараў асушаных зямель, што складае 63% ад сельскагаспадарчых угоддзяў, якія калісьці былі забалочанымі. Некаторыя гаспадаркі поўнасцю знаходзяцца на меліяраваных землях. І ўвесь гэты аб'ём неабходна абслугоўваць, каб ворныя землі давалі стабільны і багаты ўраджай.

Пастаяннае ўзаемадзеянне з райвыканкамам, гаспадаркамі, сельсаветамі, рознымі арганізацыямі дапамагае кіраўніцтву ПМС забяспечваць прадпрыемству партфель заказаў. Геаграфія работ не абмяжоўваецца Кобрынскім раёнам: меліяратары працавалі ў Драгічынскім і Камянецкім раёнах. Прадпрыемства таксама рэалізуе праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў Рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Званец».

УП «Кобрынскае ПМС» выконвае шырокі спектр работ у сферы меліярацыі. На ўзбраенні прадпрыемства ўласны транспартны парк, штат вопытных супрацоўнікаў, паўнацэнна ўкамплектаваная матэрыяльна-тэхнічная база. У складзе меліярацыйнага прадпрыемства два рамонтна-эксплуатацыйныя ўчасткі, якія ажыццяўляюць рамонт і догляд за асушальнай сеткай і гідратэхнічнымі збудаваннямі, участак

помпавых станцый, які выконвае водапаніжэнне на меліяраваных землях, аддзел механізацыі па рамонце меліярацыйнай і іншай будаўнічай тэхнікі.

Асноўная задача Кобрынскага ПМС - паляпшэнне тэхнічнага стану, удасканаленне меліярацыйных сістэм у мэтах стварэння ўмоў для павышэння прадукцыйнасці працы ў сельскагаспадарчай вытворчасці і эфектыўнага выкарыстання меліяраваных зямель. Для выканання рамонтна-эксплуатацыйных работ на асушальнай сетцы ёсць аднакаўшовыя экскаватары, бульдозеры, колавыя трактары, касілкі ўсіх марак, аўтамабілі, аўтакран. Усяго на балансе прадпрыемства больш за 60 адзінак тэхнікі. У цэлым матэрыяльна-тэхнічная база дае магчымасць выконваць значны аб'ём работ, якія выконваюцца аператыўна, якасна і своечасова.

З кожным годам Кобрынскае ПМС пашырае спектр сваіх магчымасцей. У 2022 годзе калектыў прымаў удзел у будаўніцтве буйнога малочнатаварнага комплексу «Дзявяткі» ў ААТ «Батчы», годам раней - МТФ «Старадубцы» ў ААТ «Гарадзец-Агра», праведзена перабудова маста праз Мухавец на шлюз-рэгулятар - складаны аб'ект, які будавалі зімой. У 2023 годзе ў Кобрынскім раёне па плану ўвесці ў сельгасабарот больш як 3200 га зямель, якія пачалі зарастаць драўняна-хмызняковай расліннасцю - гэта 7 аб'ектаў рэканструкцыі і 10 аб'ектаў культуртэхнічнай меліярацыі, работы вядуцца сумесна з ПМК-52. У красавіку бягучага года ўведзены ў эксплуатацыю вялікі аб'ект «Рэканструкцыя меліярацыйнай сістэмы "Стары двор"» у ААТ «Раданежскае» плошчай 322 га. Сіламі Кобрынскага ПМС завершаны аб'екты культуртэхнічнай меліярацыі меліярацыйных сістэм «Праўда Энгельса» паблізу аг. Лука, «Польскае балота» (ТАА «Дружба-Агравытворчасць») і «Кастрычнік» (ААТ «Гарадзец-агра»).

Актыўная пазіцыя на рынку працы дае вынік: калектыў не прастойвае, сярэдняя зарплата - больш за 1 тысячу рублёў. На прадпрыемстве працуе каля сотні спецыялістаў рознай накіраванасці. Маладым супрацоўнікам перадаюць свой вопыт ветэраны вытворчасці. Калектыў, які ўзначальвае дырэктар Васілій Міхайлавіч Піўчык, працягвае традыцыі прадпрыемства. Меліяратары ўносяць свой уклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны, выконваюць найважнейшую задачу - дапамагаюць аграрыям гарантаваць харчовую бяспеку і эканамічную незалежнасць краіны.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Кобринское ПМС 70 лет /** [автор текста Е. Жук ; гл. ред. В. Шпарло]. – Брест : РИА «Вечерний Брест», 2003. – 64 с. : ил.

**Горегляд Дмитрий Васильевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Деловой мир СНГ. – Минск, 2006. – Вып. 3. – С. 93.

Д. В. Горегляд – директор Государственного производственного предприятия «Кобринское ПМС» с 1997 г.

**Лукашик, П.** Полвека на трассах каналов / Пётр Лукашик. – Брест : ОАО «Брестская типография», 2003. – 55 с. : фот.

**Лукашик, П.** Обновление земли / Пётр Лукашик. – Брест : ОАО «Брестская типография», 2001. – 100 с. : фот.

**Лукашик, П.** Богатства страны будут прирастать Полесьем : история мелиорации земель Брестчины / Пётр Лукашик // Берасцейскія карані 98 : гісторыка-краязнаўчы і літаратурны зборнік. – Брэст, 1998. - С. 20-30.

**Белов, Д.** Чтобы земля дарила урожаи / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2023. – 3 чэрвеня (№ 40). – С. 1, 4.

О работе Кобринского ПМС, которому недавно исполнилось 70 лет, рассказал директор Василий Пивчик.

**Белов, Д**. К родной земле — с заботой и любовью / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2022. - 4 чэрвеня (№ 41). — С. 1, 3 : фот.

О работе УП «Кобринское ПМС» по рассказу директора предприятия В. Пивчика.

**Васюк, Н.** Василий Пивчик, директор Кобринского ПМС: «Мелиорация означает “улучшение”» / Наталья Власюк // Вечерний Брест. - 2022. — 3 июня (№ 22). — С. 1 (приложение: Экспресс-Вечерний Брест ; № 1).

О работе Кобринского предприятия мелиоративных систем.

**Белов, Д.** Земле — забота и уход / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. — 5 чэрвеня (№ 44). — С. 4 : фот.

О работе УП «Кобринское ПМС» по рассказу директора предприятия В. Пивчика.

**Новохрост, А.** Сделать землю лучше / Александр Новохрост ; фото Вадима Якубёнка // 7 дней. - 2021. — 3-9 июня (№ 22). - С. 16 : фот.

О работе УП «Кобринское ПМС» по рассказу директора Василия Пивчика.

**Бялоў, Д.** З клопатам аб роднай зямлі / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2020. — 6 чэрвеня (№ 43). — С. 1 : фат.

Аб рабоце УП «Кобрынскае ПМС».

**Литвинович, Е.** В. Работ — на весь год / Евгений Литвинович ; фото Александра Шульгача // Заря. - 2020. — 12 декабря (№ 100). — С. 18 : фот.

О сфере деятельности УП «Кобринское ПМС».

**Ярмошук, Н.** Опыт и молодость / Николай Ярмошук ; фото Александра Шульгача // Заря. - 2020. — 6 июня (№ 46). — С. 14.

О работе УП «Кобринское предприятие мелиоративных систем».

**Белов, Д**. Залог будущих урожаев / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 1 чэрвеня. — С. 3.

Будни и праздники кобринских мелиораторов.

**Пашковіч, Л.** Іх дзень пачынаецца рана ... / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2019. — 8 чэрвеня. — С. 3.

Калектыў прадпрыемства меліярацыйных сістэм налічвае 105 чалавек.

**Пашкович, Л.** Помощники земледельцев / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2018. — 17 лістапада. — С. 4.

Кобринское ПМС выполняет работы на осушительной сети.

**Белов, Д.** Улучшая качество земли / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2018. — 2 чэрвеня. — С. 2.

Улучшение качества земли — основная задача кобринских мелиораторов.

**Вовк, Ю**. Прививая любовь к футболу / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 25 октября. — С. 3.

Игроки «Кобринское ПМС» стали лидерами «Триумф-лиги» по футболу.

**Бялоў, Д.** Калі зямля патрабуе дагляду / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 3 чэрвеня. — С. 1, 3.

Напярэдадні прафесійнага свята размова з дырэктарам УП «Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм».

**Литвинович, Е.** Операция «Демаркация», или Как кобринские мелиораторы границу рисовали / Евгений Литвинович // Заря. - 2017. — 4 марта. — С. 12.

Кобринское ПМС выполнило заказ Государственного пограничного комитета - демаркация белорусско-украинской государственной границы.

**Белов, Д.** По-человечески, по-флотски, по-мужски / Дмитрий Белов ; фото автора и из архива Леонида Колтунчика // Кобрынскі веснік. - 2016. — 20 красавіка (№ 32). — С. 6

Жизненный путь директора УП «Кобринское предприятие мелиоративных систем» Л. Р. Колтунчика.

**Белов, Д.** Чтобы земля благодарила урожаем / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2016. — 4 чэрвеня. — С. 1, 3.

В канун профессионального праздника Дня мелиоратора - о работе сотрудников ГУПП «Кобринское ПМС».

**Белов, Д.** Семья, карьера и судьба / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2015. – 6 чэрвеня. – С. 2.

Накануне профессионального праздника мелиораторов – об УП «Кобринское ПМС» и его работниках.

**Волков, С.** «Морские университеты» Леонида Колтунчика / Сергей Волков // Заря. - 2015. — 25 ліпеня. — С. 11. – С. 11.

О директоре Кобринского предприятия мелиоративных систем Л. Колтунчике.

**Бурдыка, В**. Моцны характар супраць вялікай вады / Вячаслаў Бурдыка ; фота Аляксея Ганчука // Народная трыбуна. - 2014. —11 ліпеня. — С. 4, 9.

Калектыў Кобрынскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм нават у неспрыяльных умовах вырашае самыя складаныя задачы.

**Бялоў, Д.** І па фінансах на моцным плюсе / Дзмітрый Бялоў ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. – 2014. – 31 мая. – С. 2.

Дырэктар прадпрыемства меліярацыйных сістэм Д. Гарагляд аб справах і планах меліяратараў.

**Сідарук, І.** Курсам вышэй плыні : Кобрынскаму прадпрыемству меліярацыйных сістэм - 60 гадоў / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. - 23 сакавіка. - С. 3.

**Сідарук, І.** У юбілейны – клопат штодзённы : заўтра – дзень меліяратара / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. – 1 чэрвеня. – С. 2 : фат.

Штодзённыя клопаты і задачы прымушаюць Кобрынскае ПМС задзейнічаць усе існуючыя сілы і рэсурсы.

**Сідарук, І.** Ці «спяць» зімой меліяратары? / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. - 13 лютага. - С. 3 : фат.

Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм.

**Федаровіч, І.** Меліяратары дзейнічаюць актыўна / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2013. — 11 верасня. — С. 3.

Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм.

**Палескі, Я**. Крэда Алега Шыдловіча / Ян Палескі // Кобрынскі веснік. - 2012. - 2 чэрвеня. - С. 3.

Пра экскаватаршчыка Кобрынскага ПМС А. Шыдловіча.

**Гарагляд, Д.** У цесным узаемадзеянні / Дзмітрый Гарагляд ; [гутарыў] Ян Палескі // Кобрынскі веснік. - 2011. - 16 лістапада. - С. 4 : фат.

Дзейнасць Кобрынскага ПМС непасрэдна звязана з сельскагаспадарчымі структурамі раёна.

**Сацук, А.** Яны былі першымі / Аляксей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2010. - 5 чэрвеня. - С. 1.

Першымі на забалочаныя землі прыходзілі меліяратары.

**Пянко, А.** Не дожидаясь весны / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 17 студзеня (№ 4). – С. 2 : фот.

Продуманная организация труда на предприятии мелиоративных систем создает активную работу с начала года, не дожидаясь весны.

**Сацук, А.** Почётная миссия – возрождение земли / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. – 2009. – 17 студзеня. – 6 чэрвеня. – С. 1.

УП «Кобринское ПМС» из года в год выполняет почетную миссию по возрождению и улучшению плодородия земли.

**Сацук, А.** На гидросистемах порядок / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 4 чэрвеня. – С. 1-2.

О работе предприятия мелиоративных систем.

**Пянко, А.** Мастера / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 5 чэрвеня. – С. 1 : фот.

Об экскаваторщиках предприятия мелиоративных систем А. Шостаке и А. Шоргаровском.

**Горегляд, Д.** Мелиорация Бересцейщины – дело и судьба поколений / Дмитрий Горегляд ; [беседовал] Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 4 чэрвеня (№ 66). – С. 2 : фот.

РУП «Кобринское ПМС».

«**Золотые** руки у наших механизаторов», говорят в коллективе Кобринского ПМС «Брестмелиоводхоза» о тех, кто наводит порядок на каналах // Заря. – 2000. – 10 октября (№ 115). - С. 2.

**Гарагляд, Д.** Па шляхах меліярацыйнай славы. Што на іх сёння? / Дзмітрый Гарагляд ; [гутарку правяла] М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1995. – 2 жніўня. – С. 2.

Гутарка з кіраўніком Кобрынскага міжраённага упраўлення асушальна-арашальных сістэм Д. В. Гараглядам.

Кобрынскі раён
Кобрынскае ПМС
Меліяратары
Прадпрыемствы